

28.06.2020 - ГОМЕЛЬШЧЫНА, Рэгіёны

# Дарожная азбука ад інспектара ДАІ

**З ранняга дзяцінства дзіця павінна атрымаць асновы дарожнай азбукі. Усё, што засвойваецца ў гэтым узросце, трывала застаецца ў памяці.**



З першых дзён знаходжання малога ў дзіцячым садзе, мы, педагогі, імкнемся арганізаваць яго выхаванне і навучанне так, каб да моманту пераходу з дзіцячага саду ў школу выхаванец лёгка арыентаваўся ў асяроддзі, умеў назіраць і правільна ацэньваць дарожныя сітуацыі, валодаў навыкамі бяспечнага руху. Навучанне дзяцей бяспецы дарожнага руху – адна з асноўных задач дарослых.

У чэрвені адбылася сустрэча выхаванцаў санаторнага яслі-сада Брагіна з інспектарам ДПС АДАІ Брагінскага РАУС капітанам міліцыі Аляксеем Гардзейчыкам. Мэта – прафілактычная работа па выкананні выхаванцамі патрабаванняў бяспечнага знаходжання ля дарог, у час катання на самакатах і веласіпедах.

Падчас гутаркі інспектар распавёў дзецям пра тое, як трэба паводзіць сябе на дарозе, якія дарожныя знакі неабходна ведаць і што рабіць для прадухілення дарожна-транспартнага здарэння. Таксама дзеці замацавалі правілы пераходу праезнай часткі.



Праводзілася практычная адпрацоўка навыкаў перасоўвання на веласіпедах і самакатах па праезнай частцы дарогі, пешаходаў – па пешаходным пераходзе, выконваючы сігналы святлафора.

На тэрыторыі дзіцячага сада абсталявана пляцоўка для вывучэння правіл дарожнага руху. Гэта дапамагае лепш засвоіць правілы паводзін на дарозе і быць уважлівымі да вулічнага руху. На сайце нашай установы ў рубрыцы "Бацькам" ёсць падборка вершаў і загадак па вывучэнні правіл дарожнага руху.

Дарэчы, самы лепшы спосаб навучання дзіцяці – гэта асабісты прыклад дарослых, бацькоў, тых, хто з'яўляецца для яго аўтарытэтам. Дзіця павінна гуляць толькі пад назіраннем дарослых і ведаць: на дарогу выходзіць нельга!

Назірайце за сітуацыямі на вуліцы, дарозе, за пешаходамі і транспартам, святлафорам і абавязкова абмяркоўвайце з дзіцем убачанае. Навучыць дзіця правільным паводзінам на вуліцы – значыць дапамагчы захаваць яго здароўе і жыццё.

**Алена МАКАРАНКА,**
**кіраўнік фізічнага выхавання санаторнага яслі-сада Брагіна**

### Поделиться ссылкой:

« Летапісец маленькай вёсачкі    Свет прафесій – вачамі дзяцей »

## Related Posts



Свята паветраных шароў
30.06.2020



Чатыры станцыі ў гісторыю роднага краю
30.06.2020

### About admin

Read All Posts By admin

### Пакінуць адказ

Вы павінны ўвайсці, каб пакінуць каментар.

Search …

## Свежыя запісы

- Як дзецям зарабіць у час летніх канікул?
- "Пакаленне New" адправілася ў поле
- Свята паветраных шароў
- Чатыры станцыі ў гісторыю роднага краю
- Выбіраем здароўе і жыццё

Месца для вашай рэкламы




























Следите ли вы за изменениями в образовательном законодательстве?

- Конечно, я регулярно слежу за ними на официальных сайтах и в печати. 100%
- Обращаю внимание только на те, которые вызвали резонанс в образовательном сообществе. 0%
- Читаю только то, что мне сказали/приказали прочитать и ознакомиться 0%
- Ничего не читаю, потому что на это нет ни времени, ни сил, ни желания... 0%
- А разве от этого что-то изменится? 0%

Vote




ОФИЦИАЛЬНЫЙ ИНТЕРНЕТ-ПОРТАЛ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Copyright © All rights reserved. Mega Magazine by ProDesigns